**7.** Паслухайце адзін з твораў І. С. Баха. Намалюйце свае ўражанні ад твора.

**8.** Падрыхтуйце інфаграфіку пра жыццё і дзейнасць В. А. Моцарта.

# § 16. Французская рэвалюцыя




**Успомніце.** *Што такое рэвалюцыя? Калі і дзе адбыліся першыя буржуазныя рэвалюцыі? Якія іх вынікі?*

Французская рэвалюцыя XVIII ст. — адна з найважнейшых падзей сусветнай гісторыі. Яна была вынікам незадаволенасці розных пластоў французскага грамадства феадальнымі перажыткамі. Да гэтага часу не змаўкаюць спрэчкі аб характары рэвалюцыі, яе значэнні і наступствах.

**Вы даведаецеся.** *Якімі прычынамі была выклікана Французская рэвалюцыя. Якія змены ў Францыі адбыліся ў ходзе рэвалюцыі. Як падзеі канца XVIII ст. у Францыі паўплывалі на краіну і на ход сусветнай гісторыі.*

**1. Прычыны рэвалюцыі.** У Францыі даўно пачалі складвацца капіталістычныя адносіны. Але іх развіццю перашкаджалі феадальныя абмежаванні — абсалютысцкая ўлада манарха і саслоўныя прывілеі духавенства і дваранства. Гэтыя два саслоўі карысталіся адной з найважнейшых прывілей — не плаціць падаткі ў каралеўскую казну.

Найбольш цяжкім было становішча сялян (каля 20 млн), якія выплачвалі пазямельны падатак дзяржаве, феадальную рэнту — свайму

гаспадару, адну дзясятую ўраджаю (дзесяціну) — царкве. Але нават вельмі адукаваныя і багатыя людзі з трэцяга саслоўя не маглі разлічваць на першыя ролі ў дзяржаве.

Пры ўсіх сваіх адрозненнях прадстаўнікоў трэцяга саслоўя аб'ядноўвала поўная адсутнасць палітычных правоў і жаданне змяніць існуючыя парадкі. Такая магчымасць прадставілася ў перыяд паслаблення каралеўскай улады ў канцы XVIII ст.

У гэтых умовах манархія не прыняла ніякіх мер для справядлівага ўрэгулявання супярэчнасцей паміж кіруючымі элітамі і пераважнай большасцю французскага народа. Падаткі як паступалі, так і працягвалі спраўна паступаць у каралеўскую казну. «На мой век хопіць! Пасля нас хоць патоп!»— гэтую фразу прыпісваюць каралю Людовіку XV, падчас кіравання якога стаў прыкметным заняпад французскага абсалютызму.

**Сацыяльная структура французскага грамадства ў канцы XVIII ст.**

| | Саслоўе | Склад | Абавязкі перад дзяржавай |
|---|---|---|---|
| 4 % | Першае | Духавенства | «Малітва» |
| | Другое | Дваранства | «Шпага» |
| | Трэцяе | Буржуазія, багатыя купцы, банкіры, сялянства, гарадскія рабочыя, рамеснікі, беднота | Падатак |

*Выкарыстоўваючы матэрыял табліцы і тэксту параграфа, раскажыце пра становішча сялян.*
*Як вы разумееце асноўныя абавязкі кожнага саслоўя?*

Такім чынам, асноўнымі прычынамі Французскай рэвалюцыі былі самавольства каралеўскай улады, прывілеі дваранства і духавенства, паборы і падаткі, палітычнае бяспраўе народа.

**2. Крызіс старога парадку і пачатак рэвалюцыі.** У канцы кіравання Людовіка XVI у Францыі распачаўся грамадска-палітычны крызіс. Манархія апынулася на мяжы фінансавай катастрофы: казна была

151—154

пустая, а банкіры адмаўляліся прадастаўляць новыя пазыкі. Харчовы крызіс (з-за неўраджаяў) толькі пагаршаў становішча. Пачаліся голад, хлебныя бунты. Тысячы сялян запоўнілі Парыж.

У такіх умовах урад прыняў рашэнне абкласці падаткам і прывілеяваныя саслоўі. Для зацвярджэння новага падаткаабкладання Людовік XVI 5 мая 1789 г. склікаў саслоўна-прадстаўнічы орган — Генеральныя штаты, якія не збіраліся з 1614 г. Як выявілася, гэта было пагібельным рашэннем для манархіі і самога караля. У ходзе пасяджэнняў дэпутаты ад трэцяга саслоўя адважыліся на рэвалюцыйныя дзеянні. 17 чэрвеня 1789 г. яны абвясцілі сябе Нацыянальным сходам і запатрабавалі ўвядзення канстытуцыі. 9 ліпеня Нацыянальны сход быў пераўтвораны ва Устаноўчы сход. Такім чынам, трэцяе саслоўе абвясціла сябе паўнамоцным прадстаўніком усёй нацыі і выказала рашучасць усталяваць у краіне новы грамадскі лад. Частка дэпутатаў ад духавенства і дваран амаль адразу далучыліся да новага парламента. Кароль спрабаваў спыніць непажаданае развіццё падзей, але беспаспяхова.

На барацьбу з манархіяй падняліся народныя масы. ***14 ліпеня 1789 г.*** у Парыжы ўспыхнула паўстанне. Паўстанцы разрабавалі збройныя крамы і вайсковы арсенал. Галоўнай падзеяй паўстання было ўзяцце Бастыліі — сярэднявечнай крэпасці, у якой знаходзілася турма. У час яе штурму пралілася першая кроў. Гэты дзень лічыцца пачаткам рэвалюцыі і адзначаецца французамі як нацыянальнае свята.



Селянін цягне на сваім гарбе святара і арыстакрата. Французская карыкатура

*Як вы разумееце подпіс да гэтай карыкатуры: «Варта спадзявацца, што хутка гэтая гульня скончыцца»? Вызначце прыблізны час стварэння дадзенай карыкатуры. Падумайце, чым можа завяршыцца сітуацыя, адлюстраваная на карыкатуры. Растлумачце свой пункт гледжання.*

147—150 **3. Рэвалюцыйныя пераўтварэнні і рэформы.** 26 жніўня 1789 г. Устаноўчы сход прыняў найважнейшы дакумент Французскай рэвалюцыі — Дэкларацыю правоў чалавека і грамадзяніна. У ёй абвяшчаліся асноўныя ідэі Французскай рэвалюцыі: свабода слова, свабода сумлення, недатыкальнае і свяшчэннае права ўласнасці.

У ходзе рэвалюцыйных падзей паглыбляліся рэформы і пераўтварэнні. Адмысловымі дэкрэтамі (рэвалюцыйнымі законамі) ліквідаваліся стары саслоўны падзел і саслоўныя прывілеі, усе тытулы дваранства і духавенства, феадальныя павіннасці, усталёўваліся свабода гаспадарчай, прадпрымальніцкай дзейнасці і грамадзянская роўнасць. Сяляне атрымалі магчымасць стаць паўнапраўнымі ўласнікамі зямлі. Уся маёмасць царк-

*Як вы разумееце дэвіз Французскай рэвалюцыі: «Свабода, роўнасць, братэрства»?*



Штурм Бастыліі. Мастак *Жан-П'ер Уэль*. 1789 г.

*Уявіце сябе журналістам французскай газеты XVIII ст. Складзіце разгорнуты план рэпартажу з месца падзей, адлюстраваных на карціне.*

вы перадавалася ў распараджэнне дзяржавы, а духоўныя асобы сталі дзяржаўнымі служачымі. Аднак большасць прадстаўнікоў духавенства адкрыта выступіла супраць перамен.

**4. Канстытуцыя 1791 г.** У верасні 1791 г. Устаноўчы сход прыняў Канстытуцыю і на гэтым завяршыў сваю працу. На змену яму быў абраны новы орган — Заканадаўчы сход. Першая ў гісторыі Францыі канстытуцыя абмяжоўвала каралеўскую ўладу і ўсталёўвала рэжым канстытуцыйнай манархіі. Аднапалатнаму парламенту належала вышэйшая заканадаўчая ўлада, а каралю — вышэйшая выканаўчая. Ствараўся таксама незалежны ад гэтых дзвюх галін улады вярхоўны суд.

Выбарчыя правы атрымлівалі толькі мужчыны, якія выплачвалі пэўную суму падатку з маёмасці (маёмасны цэнз).




Склад Заканадаўчага сходу

Тон у парламенце задавалі дзве палітычныя групоўкі: левыя і правыя. Так іх назвалі таму, што яны размяшчаліся ў зале пасяджэнняў па розныя бакі ад крэсла старшыні сходу.

**5. Скіданне манархіі і ўсталяванне рэспублікі.** Кароль, хоць і пакляўся ў вернасці канстытуцыі, у рэальнасці не думаў ёй падпарадкоўвацца. Яшчэ ў 1791 г. ён спрабаваў збегчы з Парыжа, але ўжо 10 жніўня 1792 г. у ходзе паўстання быў звергнуты. Гэта падзея фактычна паклала пачатак рэспубліканскаму ладу ў Францыі. ***22 верасня 1792 г.*** рэвалюцыйны парламент (Нацыянальны канвент) афіцыйна скасаваў каралеўскую ўладу і абвясціў Францыю рэспублікай. Людовік XVI паўстаў

перад судом па абвінавачанні ў здрадзе. Суд прыгаварыў яго да смяротнага пакарання, і 21 студзеня 1793 г. кароль Францыі быў абезгалоўлены з дапамогай гільятыны.

Гільятына (фр. *guillotine*) — механізм для выканання смяротнага пакарання шляхам адсячэння галавы. Упершыню яна была выкарыстаная ў Францыі ў 1792 г. па прапанове французскага лекара Жазэфа Гільятэна. «Часовая зброя гуманнага пакарання», як называлі гэты механізм, выкарыстоўвалася ў Францыі на працягу 185 гадоў і пазбавіла жыцця караля з каралевай, многіх дваран і саміх рэвалюцыянераў, заснавальніка сучаснай хіміі Антуана Лавуазье, а таксама тысячы ўяўных і сапраўдных злачынцаў.

154—155

**6. Перыяд якабінскай дыктатуры.** Пакаранне французскага караля выклікала абурэнне ў Еўропе. Еўрапейскія дзяржавы аб'ядналіся для сумеснай барацьбы з рэвалюцыйнай Францыяй. У краіну ўварваліся прускія і аўстрыйскія войскі. Увесну 1793 г. становішча стала крытычным. Пачаліся мяцяжы і паўстанні, арганізаваныя раялістамі — прыхільнікамі караля.

Неспакойна было і ў Парыжы. Тут нарастала незадаволенасць гарадскіх нізоў, якія патрабавалі ад урада ўсталяваць цвёрдыя цэны на прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці, а таксама прыняць суровыя меры супраць мяцежнікаў. У Парыжы ўспыхнула паўстанне (31 мая — 2 чэрвеня 1793 г.), на хвалі якога якабінцы захапілі ўладу ў Нацыянальным канвенце. Пасля гэтага яны сталі кіроўнай сілай рэвалюцыі.



Максімільен Рабесп'ер. *Невядомы мастак.* Каля 1792 г.

Правадыр якабінцаў Максімільен Рабесп'ер лічыў, што толькі з дапамогай дыктатуры можна навесці ў краіне парадак і вырашыць праблемы, якія перад ёю стаялі. Асноўным інструментам якабінцаў стаў тэрор, які ажыццяўляўся рэвалюцыйным трыбуналам (судом). Мэтай гэтай палітыкі было застрашванне «ворагаў рэвалюцыі» і падаўленне іх волі да супраціву.

На смяротнае пакаранне якабінцы адправілі дзясяткі тысяч людзей, уключаючы шматлікіх прадстаў-

нікоў духавенства і знаці, удаву караля Марыю-Антуанету. Не абмінуў гэты лёс і нядаўніх саюзнікаў якабінцаў.

Нягледзячы на цяжкасці, якабінцы здолелі ажыццявіць вайсковую рэформу і стварыць баяздольную, амаль мільённую армію. Да канца 1793 г. ім удалося ачысціць краіну ад іншаземных войскаў і часткова задушыць раялісцкі мяцеж на паўночным захадзе краіны. 161—164

Аднак узмацненне жорсткасці дыктатуры і тэрору вясной 1794 г. выклікала незадаволенасць нават сярод найбліжэйшага атачэння Рабесп'ера. У Канвенце супраць яго наспела змова. Дзяржаўны пераварот быў ажыццёўлены ***27 ліпеня 1794 г.***, або 9 тэрмідора II г. рэспублікі паводле рэвалюцыйнага календара (увайшоў у гісторыю пад назвай тэрмідарыянскага). На наступны дзень Рабесп'ер і яго паплечнікі былі пакараныя смерцю без суда і следства.

Новыя кіраўнікі Францыі — больш памяркоўныя прыхільнікі рэвалюцыі, з аднаго боку, уціскалі якабінцаў і задушвалі выступы гарадскіх нізоў, а з другога — змагаліся супраць манархістаў.



Пакаранне Марыі-Антуанеты. Мастак *Ісідор Станіслас Хелман.* 1793 г.

*Як вы думаеце, пра што сведчыць масавае выкарыстанне гільятыны ў Францыі часоў якабінскага тэрору?*

**7. Ад тэрмідарыянскага перавароту да ваеннай дыктатуры Напалеона Банапарта.** У 1795 г. Нацыянальны канвент распрацаваў і прыняў новую канстытуцыю. У краіне замацоўваліся рэспубліканскі лад і ўсе здабыткі рэвалюцыі. Заканадаўчай уладай надзяляўся двухпалатны парламент: ніжняя палата («Савет пяцісот») прымала законы, а верхняя («Савет старэйшын») іх зацвярджала. Выбарчыя правы былі абмежаваныя маёмасным цэнзам і цэнзам аселасці, таму найбяднейшае насельніцтва краіны не прымала

*Як вы думаеце, чые інтарэсы абараняла новая тэрмідарыянская ўлада?*






Французская рэвалюцыя 1789—1799 гг.

*Ахарактарызуйце стаўленне насельніцтва Францыі да якабінскай дыктатуры, выкарыстоўваючы картасхему і тэкст параграфа.*

ўдзелу ў выбарах. Выканаўчая ўлада належала пяці дырэктарам, якія па чарзе абіраліся парламентам. Так у Францыі ўзнікла ўлада выканаўчай Дырэкторыі, якая адстойвала інтарэсы буйной буржуазіі.



Напалеон Банапарт.
Мастак *Андрэа Апіяні.*
1800 г.

Паколькі становішча ў краіне заставалася няўстойлівым і напружаным, новая буржуазія, палітыкі і фінансісты прынялі рашэнне з дапамогай арміі ажыццявіць дзяржаўны пераварот і ўсталяваць дыктатуру. Па дапамогу звярнуліся да папулярнага ў краіне генерала Напалеона Банапарта. ***9 лістапада 1799 г.*** той бесцырымонна разагнаў парламент і фактычна сканцэнтраваў у сваіх руках усю паўнату ўлады. Гэтымі падзеямі завяршылася Вялікая Французская рэвалюцыя.

*Рэвалюцыя адкрыла новую эпоху ў гісторыі Францыі і ўсёй Еўропы. Яна вырашыла многія задачы, якія былі пастаўлены асветнікамі. Ліквідаваліся сярэднявечныя павіннасці сялянства і сеньярыяльная ўласнасць на зямлю. Францыя стала рэспублікай. Рэвалюцыя ўвяла роўнасць усіх перад законам. Але пры гэтым нельга забываць, што прагрэс зацвярджаўся з дапамогай гвалту, каштаваў многіх чалавечых жыццяў.*

150—151

*Французская рэвалюцыя аказала значны ўплыў на ход сусветнай гісторыі. Яе ідэі былі ўспрыняты іншымі краінамі і кантынентамі.*

***Ключавыя словы:*** *тэрор, дыктатура, Напалеон Банапарт, канстытуцыя.*

**Пытанні і заданні**

1. Складзіце схему «Прычыны Французскай рэвалюцыі».
2. Назавіце вынікі прыняцця Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна для Францыі. У чым, на вашу думку, заключаецца гістарычнае значэнне гэтага дакумента?
3. Пацвердзіце матэрыяламі параграфа той факт, што Канстытуцыя 1791 г. абмяжоўвала абсалютызм у Францыі.

**4.** Запоўніце ў сшытку табліцу «Падзеі Французскай рэвалюцыі».

| Падзея | Дата | Вынікі |
| --- | --- | --- |
| | | |

**5.** Растлумачце, што такое якабінская дыктатура. Выкарыстайце для адказу матэрыял параграфа.
**6.** Як вы думаеце, якія мерапрыемствы якабінцаў выклікалі незадаволенасць народа? Пацвердзіце сваё меркаванне фактамі.
**7.** Падрыхтуйце прэзентацыю па тэме «Французская рэвалюцыя XVIII ст.». Складзіце ў сшытку план вашага выступлення. Падбярыце ілюстрацыі па тэме.
**8.** Ахарактарызуйце Французскую рэвалюцыю, выкарыстоўваючы памятку 2 (с. 221).

## § 17. Паўднёвыя і заходнія славяне

**1526 г. — 1569 г. — 1618–1620 гг. — 1620 г. — 1681 г.**

**Успомніце.** *Якім было становішча Чэхіі ў складзе Свяшчэннай Рымскай імперыі? Якія наступствы для паўднёвых славян мела заваяванне туркамі-асманамі Балканскага паўвострава?*

У XVI–XVIII стст. паўднёвыя і заходнія славяне перажывалі адзін з найбольш складаных перыядаў сваёй гісторыі. Паўднёвыя славяне апынуліся пад уладай турэцкіх заваёўнікаў. Чэхія і Славакія належалі аўстрыйскім Габсбургам. Толькі Польшча ў складзе Рэчы Паспалітай да канца XVIII ст. заставалася незалежнай дзяржавай.

**Вы даведаецеся.** *Якім было становішча заходніх і паўднёвых славян у складзе іншых дзяржаў. У чым выявіўся рост нацыянальнай самасвядомасці славянскіх народаў.*

**1. Чэхія.** У 1526 г. Чэхія перайшла пад уладу Габсбургаў. З таго часу на чэшскіх землях пачаўся ўціск пратэстантаў. У рэшце рэшт гэта пры-